№ 6 (43) Вільня, красавік 1925 г. Цана асобнага нумару 10 грошаў.

Рабочыя і сяляне усіх краёў, злучайцеся!

ЧЫРВОНЫ СЬЦЯГ

ОРГАН КАМУНІСТЫЧНАЕ ПАРТЫІ ЗАХОДНЕЙ БЕЛАРУСІ.

Няхай жыве Злучаная Беларуская Сацыялістычная Савецкая Рэспубліка!

Таварышы! Дапамагайце свайму падпольнаму друку!

На выданьне падпольных газэт і літэратуры патрэбны вялікія грошы. Іх павінны зьбіраць сябры партыі і сымпатыкі.

Кожны рабочы і селянін, кожны інтэлігэнт павінен частку сваіх заработкаў аддаваць на партыйны друк.

Ахвяры павінны запісывацца на нумераваныя падпісныя лісты, якія выпусьціла партыя.

ЧЫРВОНЫ ДЗЕНЬ.

Першае мая гэта ня дзень паноў і дармаедаў. Гэта наш дзень, дзень беднаты, дзень салідарнае барацьбы работнікаў ўсяго сьвету, ўсяе зямлі з багачамі, з фабрыкантамі і банкірамі, з абшарнікамі, з царамі, князьямі, генераламі і ўсімі, хто памагае катаваць, панаваць і эксплёатаваць працоўных.

Пралетары ўсіх краёў і ўсіх народаў жывуць у гэты дзень аднэю думкаю, адным імкненьнем: скінуць ярмо капіталу і навекі вечныя устанавіць на зямлі новыя парадкі, устанавіць царство працы.

Спачатку першае мая было выключна пралетарскім сьвятам. Але з часам, калі рэвалюцыйны работніцкі рух набраўся сілы, калі пралетарыят сьмела ўзяў на сябе місію асвабадзіцеля ўсяго прыгнечанага чалавечаства, — пад чырвоныя сьцягі мая ідуць новыя і новыя мільёны прыгнечаных капіталам людзей, а перада ўсім мільёны сялянскай беднаты і прыгнечаныя народы Ўсходу і Заходу. Ня толькі у СССР, ня толькі у прамысловых цэнтрах Эўропы і Амэрыкі будзе у дзень першага мая біцца гарачае сэрце рэвалюцыянера. Сягодня чырвоныя сьцягі падымае і закуты вялікан — працоўны індус, і адвечны раб капіталу—кітаец, і чорны нэгр.

Іскра вызваленьня, іскра рэвалюцыі занесена пралетарыятам ва ўсе канцы зямлі і не патушыць ўжо пажару рэвалюцыі праклятаму капіталу і яго слугам.

Калі параўняць становішча рэвалюцыйнага руху у пачатку гэтага веку з тым, што мы маемо цяпер; калі падлічыць, колькі зьбіта каронаў з галавы цароў; калі прыняць пад увагу, што самае чорнае гнязло рэакцыі — Расейская Імпэрыя — разбурана, а на неаб'ятных абшарах яе пануе пралетарыят; калі прыняць пад увагу, што падбіты капіталістычны сьвет Эўропы, ня гледзючы на апошнія патугі, ня ў сілах замацаваць сваіх пазыцыяў і курчыцца у прадсьмертных сударагах супярэчнасьцяў і нацыянальнае грызьні, — то нават мала сьвядомаму работніку будзе ясна, што пазыцыі міжнароднага рэвалюцыйнага руху моцныя, што сацыяльная рэвалюцыя ідзе пабедным крокам.

Для малавер'я і маладушыя сягодня няма места!

Канчатковая перамога ўжо блізка!

Міжнародны пралетарыят выпаўніць сваю місію асвабадзіцеля прыгнечаных!

І з гэтаю вераю тут, у закутай і паняволянай Зах. Беларусі, работнікі і сяляне будуць спатыкаць дзень першага мая.

З гэтаю вераю будуць яны нясьці нялічныя ахвяры за справу вызваленьня у далейшай барацьбе.

Сягодня яшчэ стогне край. Турмы і вастрогі запоўнены тысячамі лепшых сыноў Зах. Беларусі, плача яшчэ маці забітага і закатованага панамі сына, — але уздымаецца хваля пабедная, хваля мільёнаў злучаных мазолістых рук і разбурыць, разаб'е кайданы.

Беларусь, працоўная Беларусь, ад веку прыгнечаная, вялікая у сваім горы і муках, парэзаная на часткі, будзе злучанай і вольнай!

Будзе вольнай, бо ідзе пабедным крокам сацыяльная рэвалюцыя, асвабадзіцельніца чалавечаства.

З вераю у гэтую вялікую рэвалюцыю, з вераю ў насіцеля і тварца яе — пралетарыя — прыгнечаная, закутая, паняволяная Заходняя Беларусь будзе спатыкаць дзень чырвоны, дзень Першага Мая.

РЭВАЛЮЦЫЙНАМУ ПРАЛЕТАРЫЯТУ І СЯЛЯНСТВУ ПОЛЬШЧЫ І ЗАХОДНЕЙ УКРАІНЫ Ў ДЗЕНЬ ПЕРШАГА МАЯ — ПРЫВІТАНЬНЕ АД ПРЫГНЕЧАНАГА НАРОДУ ЗАХОДНЕЙ БЕЛАРУСІ!

ПРЫВІТАНЬНЕ АРЫШТАВАНЫМ.

У дзень Першага Мая лепшым сынам Заходней Беларусі, кінутым за краты панскай турмы, мучанікам за вольную незалежную БССР.—Камуністычная Партыя Заходней Беларусі насылае сваё братэрскае прывітаньне.

Верце, браты!

Верце, што працоўны народ разам з вамі.

Ён разаб'е турмы Грабскіх, Ратайскіх, Тугуттаў, як разбіў Імпэрыю Раманавых.

Усіх паноў, усіх катоў, усіх ворагаў вашых чакае такіж лёс, як і буржуеў расейскіх.

Трымайцеся цьверда, Таварышы!

Няхай жыве Рэвалюцыя!

Няхай жыве Злучаная БССР!

Камуністычная Партыя Зах. Беларусі.

УСЯ ЗЯМЛЯ БЯЗ ВЫКУПУ ПРАЦОЎНАМУ СЯЛЯНСТВУ!

ПРЭЧ АБШАРНІКАЎ, АСАДНІКАЎ, АКУПАНТАЎ!

ЗА ШТО ЗМАГАЕМАСЯ.

Беларусь—краіна пераважна земляробская; прамысловасьць яе вельмі нязначная. І дзеля таго працоўныя масы тут у Зах. Беларусі ў большасьці складаюцца з сялянства. А рэч вядомая, што як сонца расьліне, як вада рыбе, так безьзямельнаму і малазямельнаму селяніну патрэбна зямелька — маці. За зямлю, за падзел бяз выкупу абшарніцкай, скарбовай, касьцельнай і іншай зямлі паміж працоўным сялянствам павінна змагацца і ўжо змагаецца сялянства Заходняе Беларусі. Асабліва панскія абшары трэба парэзаць на кускі, парэзаць між сялян, засяліць, ўзараць іх захватныя межы, каб пан у ніякім выпадку і нікалі ня меў магчымасьці ўстанавіць свайго радавітага маёнтку.

Але як жа адабраць гэтую зямлю ад дармаедаў і абібокаў у свае працоўныя рукі? Некулькі тысячагодзьдзяў пражыло чалавецтва і вось ніяк не маглі людзі наладзіць жыцьцё так, каб ня было ні пануючых, ні прыгнечаных. І толькі бальшавікі нізрынулі на заўсёды стары парадак і аддалі фабрыкі для рабочых, а зямлю для сялян. Але-ж бальшавікі былі і ў царскія часы, а чаму тады не зрабілі гэтага дабрадзейства для працоўных? Адказ адзін: бо ня мелі ўлады ў сваіх руках. Толькі захапіўшы ўладу рабочыя і сяляне змогуць наладзіць свой дабрабыт. Вось, прыкладам, мы выбралі паслоў у польскі Сойм, яны там і лаюцца, і крычаць, і пагражаюць, аднак усё гэта памагае нам як кашаль хваробе. Не ўгаворамі, ня просьбай змусіш польскага пана адрачыся ад зямлі і ўлады, трэба не пытаючыся яго дазволу зрэпіць паганца за каўнер ды вон з маёнтку, са староства, з Сойму. Бальшавікі толькі тады і далі зямлю, як захапілі ўладу, а ўладу захапілі толькі сілком, узброенай рукой.

Значыць, кожнаму працоўнаму Зах. Беларусі, каб вызваліцца ад польска-панскага ярма, трэба ісьці па сьлядох бальшавікоў, якія і на словах і на дзеле служаць толькі працоўным, трэба змагацца за зямлю і рабоча-сялянскую ўладу. Тут неабходна адзначыць, што ў барацьбе за зямлю і ўладу сяляне і рабочыя павінны выступіць адначасна і адным супольным фронтам і тады будзе поўная пабеда над пануючай клясай, клясай абшарнікаў і капіталістаў. Так было ў Расеі ў 1917 годзе. А вось у Баўгарыі сяляне ня мелі падтрыманьня ад рабочых, а ў апошнія часы ў Эстоніі рабочыя ня мелі падтрыманьня ад сялян—і рэвалюцыйная справа пацярпела нэўдачу.

Польскі рабочы і селянін яшчэ вельмі моцна сядзіць у габзюрах польскага капіталістага і ў скванна растаўленых сетках клерыкалізму. Інакш справа рэвалюцыйная стаіць у Зах. Беларусі, дзе працоўныя масы ў значнай меры вызваліліся ад уплываў ня толькі ксяндзоў, паноў і іх прыхватняй і падваротнікаў, як „Вызваленьне“, „Пяст“, а нават—і „Незалежнай Хлопскай Партыі“. Селянін Зах. Беларусі верыць толькі бальшавікам і сам стаў бальшавіком, ён цяпер чысьціць сваё заіржаўленае аружжа, якое лішня доўга пралежала ў зямлі.

Словам, рэвалюцыйная справа ў Зах. Беларусі стаіць на рэльсах — кампартыя Зах. Беларусі дае сыгналы — гудкі да кампартыі Польшчы, але на жаль яна яшчэ зусім слабенькая і ня можа падняць сымафор, і станцыя зачынена. А тым часам насып можа асунуцца, бо сьвежа насыпаны, бо на сьпех роблены і чырвоны поезд павінен рухацца і чым хутчэй, тым лепш. Вось ён і дае поўны ход у процілежны бок, ён імчыць да Сав. Беларусі. А туды дарога заўсёды адкрыта! Але гэта ня знача, што мы павінны чакаць і спадзявацца чыейсьці помачы. Гэта будзе дурнота і трусасьць. Кожны рабочы і селянін Зах. Беларусі ў думках, на слове і на дзеле павінен уясьніць сабе, што толкі мы самі, сваімі рукамі, у рашучай барацьбе, узброенай сілай даб'ёмся зямлі, ўлады і далучэньня да Савецкае Беларусі.

ПРЭЧ ПАНОЎ!
НЯХАЙ ЖЫВЕ
ЗЛУЧАНАЯ Б. С. С. Р!

НЯХАЙ ЖЫВЕ РЭВАЛЮЦЫЙНЫ ПРАЛЕТАРЫЯТ— АСВАБАДЗІЦЕЛЬ ЧАЛАВЕЧАСТВА!

ГУТАРКА ПАНА З МУЖЫКОМ.

— Быдла, хам ты, совбандыта!
Мала, знаць, цябе набіта—
Ведай, што Рэчпаспаліта
Не тваё, сьвіня, карыта.
Я тут пан—цалуй мне боты,
Бо бязун дадасьць ахвоты.
Як ня выплаціш падаткі,
Забяру твае манаткі,
Сам да татавае хаткі
Пойдзеш, гад, за беспарадкі.

— Ціха, ціха, егамосьцю,
Бо магу ня здзержыць злосьці.
Вы, няпрошаныя госьці,
Сталі як у горле косьці.
Страсане цябе перш трасца,
А сагнуць мяне ня ўдасца!
Кроў маю, кроў рабочая
Пан па краю разьлівае,
А з крыві тэй узрастае
Чырвань—краска веснавая.
Беражыся-ж нашай сілы —
З сала пана будзе мыла!

— Слухай, браце, брыдка гэтак,—
Прытрухнуў пан на пасьледак,—
Каб не вадзіцца нам болей,
Ях даждждом сьвятых Ніколі,
Дам табе я крыху волі,
Дам на хлеб шчыпочак солі,
Ты за гэта будзь пакорны,
Бо твая, брат, костка чорна.

— А, панок мой міласьцівы,—
Селянін сказаў ласьліва —
Можа даць такую раду
Толькі розум, які ззаду...
Не рабі, панок, тут чаду
Ды ідзі лепш без агляду
На сухія вербы, лозы,
Дзе чорт пасьвіць свае козы.
Я тут сам, без пана неба
Буду хлеб мець і да хлеба.
Узрасьце ўсё, што мне трэба
Вольная мужыча глеба.
Дык, панок мой міласьцівы,
Паварачывайся жыва!

ХЛЕБА І ПРАЦЫ БЕЗРАБОТНЫМ!

ЗЯМЛІ — БЕЗЬЗЯМЕЛЬНЫМ!

Сьцеражэцеся правакатараў!

За апошні год партыйныя арганізацыі Зах. Беларусі, а так сама і арганізацыі у Польшчы шмат пастрадалі ад масавых арыштаў. Велькія правалы былі ня толькі у Лодзі, Варшаве і Дамброве, але і у Вільні, Берасьці, Беластоку, Пінску. І усюды, дзе быў больш менш значны правал — прычынаю арыштаў быў правакатар.

Правакатары бываюць двух сартоў.

1. Дэфензыва дае свайму агенту задачу пралезьці у арганізацыю, працаваць там і дабіцца даверья партыі, каб паведамляць ахранку аба ўсіх планах і дзеяльнасьці партыі. А потым, калі правакатар выведае дзе жывуць, як празываюцца і што робяць паасобныя сябры партыі,—адразу наносіцца удар—ліквідуецца цэлы рад партыйных арганізацыяў. Да такога рода правакатараў адносіцца віленскі правакатар Герцык, аб яком мы ўжо паведамлялі і які выдаў паліцыі некаторых сяброў віленскага камуністычнага саюзу моладзі і нават склады, дзе хаваліся партыйныя штандары і літэратура.

2. Другі сорт правакатараў складаецца з людзей, якія некаторы час честна і шчыра працуюць у арганізацыі, але у часе небязьпекі, арышта, або катаваньня прымушаюцца да правакацыі цаною свайго вызваленьня з турмы і выдачы сваіх таварышоў. Гэта людзі слабыя, малаверныя, непераконаныя, несьвядомыя.

Як жа аберагчы арганізацыю ад такога страшнага зла, як правакатар?

Трэба перш за ўсе ня гнацца за лікам сяброў і ўсебакова абсудзіць, абгаварыць і праверыць таго сябра, які хоча ўступіць у арганізацыю. Лепей не прыняць у арганізацыю дзесяць слабых, невыпрацаваных сяброў, чымсь па неасьцярожнасьці дапусьціць сярод іх правакатара. Лепей менш лікам—да лепшых!

Арганізацыя у падпольлі з 10 таварышоў, але верных партыі і рэвалюцыі, будзе куды больш працаздольнаю і страшнаю для ўлады і буржуазеі, чымсь арганізацыя ў 100—200 сяброў, але разлезлая, хаатычная і няпоўная.

Дык вось, каб недапусьціць у свае рады правакатараў і слабых людзей, якія могуць стаць правакатарамі, — кожны сябар партыі, пачынаючы ад самага адказнага і канчаючы радавым байцом, павінны будаваць сваю арганізацыю так, як добры гаспадар будуе сваю гаспадарку. Не на месяц, не на год, а на векі вечныя павінен будавацца партыйны дом. І зімою у сьцюжу рэакцыі, і вясною у часы хваляў рэвалюцыі,—партыйны дом павінен стаяць цьвёрда!

Але нават самую найлепшую арганізацыю бывае часам трудна уберагчы ад правакатара.

Што ж тады рабіць? Як тады з ім змагацца?

Каб абязврэдзіць правакацыю да мінімума, трэба строга берагчы правіло: сябар партыі можа і павінен ведаць толькі тых партыйных таварышоў і тыя партыйныя справы, каторыя патрэбны яму для выкананьня ўложаных на яго абавязкаў. Усялякія размовы бяз дзела,—гэта злачынства, бо можа даць правакатару матэр'ял для яго шпіёнскае работы.

А калі-ж ёсьць падазрэньне, што сябар партыі зьяўляецца правакатарам, то трэба адразу жа паведаміць аб гэтым вышэйшы орган партыі і паступаць згодна яго дырэктывам. Самавольна нічога не рабіць, бо гэта можа павясьці да непаправімых памылак.

ХВАЛЯ РЭАКЦЫІ.

Чорная дзікая рэакцыя ідзе.

Міжнародная буржуазея і буржуазея паасобных краёў са ўсіх сваіх апошніх сілаў стараецца аправіцца ад тых першых цяжкіх udараў, якія нанесла ёй рэвалюцыйная паваенная эпоха 1917—1924 гадоў.

Выкарыстаўшы перадышку, якую дала буржуазеі рабочая кляса і эканамічная слабасьць СССР,—капітал ізноў падымае сваю галаву, мабілізуе сваю чорную сотню, каб у першую чаргу абрушыцца са ўсею сілаю на рабочую клясу і адабраць у яе ўсё!

Адначасна з гэтым робіцца націск і падатковы і палітычны на саюзьніка пралетарыята — працоўнае і беднае сялянства, мільёнкыя масы якога нараўне з пралетарыятам ізноў павінны праліваць свой пот ў славу адбудовы капітала, ў славу пануючых клясаў...

Што мы бачым сягодня у Эўропе?

Ня гледзячы ні ва што, моцна трымаецца кат Мусаліні. Прасьпяваў сваю лебедзіную песьню Макданальд, без боя уступіўшы ўладу Балдуінам і Чэмберленам, якія з новаю сілаю пачалі вызыск мільёнаў рабочай клясы, а перада ўсім сваіх рабоў у Індзіі, Эгіпце, распраўляючыся беза ўсякае літасьці з прачвамі асвабадзіцельнага руху у сваіх велізарных калёніях.

У Нямеччыне ізноў падымаецца чорная цень Гагенцоллернаў ў асобе палужывага, здзяцінеўшага Гіндэнбурга, пагражаючы ня толькі рабочай клясе Нямеччыны, ня толькі Вэймарскай канстытуцыі, але у выпадку, калі-б ўдаліся пляны нямецкай буржуазеі, чорная рэакцыя запанавала б ува ўсей сярэдняй Эўропе, перакідаючыся на Ўсход.

І ўсюды, дзе рэакцыя падымае свой меч, махаючы ім над галавою рабочага,—трусьлівая, згодніцкая сацыял-дэмакрацыя уступае без бою. Так было з Мак-Данальдам, так стала з „вялікаю“ нямецкаю сацыял-дэмакрацыяй, якая падае свае галасы за клерыкала і скрытага манархіста Маркса, задавальняючыся чэчэвічнаю пахлёбкаю крускага міністэрскага партфеля. Толькі ва Францыі яшчэ безсільна барыкаецца Блюм, хапаючыся за прафэсарскія фалды Панлевэ, ды на пасьмешыще ўсяму сьвету — сярод гэтага мора чорнай рэакцыі стараецца выплыць прэмьер-міністрам бэльгійскі сацыял-згоднік Вандэрвэльдэ.

За тое ў іншых краёх аб ружовых пэрэспэктывах няма нават і гутаркі.

Чэхаславакія па старому хавае надзею на Вялікую Расею і прыкармлівае усякае масьці расейскіх рэакцыянераў. У Баўгарыі, Югаславіі, Румыніі, Грэцыі пануе адкрытая ўлада белага тэррору. У прыбалтыйскіх сабак--героем і прыкладам зьяўляецца кат Лейдонер.

Нарэшце Польшча, гэты шалены пёс рэакцыі, укусы якога прыходзіцца адчуваць нам рабочым і сялянам Заходнеі Беларусі, Польшы, Украіны кожны дзень і кожны час.

Зьяўляючыся адбіткам, адгалоскам усясьветнае рэакцыі, польская рэакцыя, дзеля таго, што яна зьяўляецца авангардам на ўсходзе, прымае формы найбольш агідныя, найбольш выразныя. Нігдзе так не гвалтуецца і не вызыскуецца рабочы і селянін, як у сучаснай Польшчы.

Клясавы рабочы прафэсыянальны рух разбіты, а арганізатары яго сядзяць у турмах. 8-часовы рабочы дзень фактычна не істнуе і павук польскі капіталіста робіць ўсё, што хоча. Безрабоцьце мучыць соткі тысяч пралетарыяў. А што робіцца у нас, на „крэсах“? Ня кажам ужо аб нас камуністых. Ня соткі, а тысячы безпартыйных сялянаў і інтэлiгэнцыі, павінных толькі ў тым, што яны беларусы, або украінцы, забіраюць без разбору і трактуюць як „бандытаў“, „дывэрсантаў“. Масавыя аблавы у Наваградчыне, Сьвенцяншчыне, Віленшчыне, Лідзе і на Валыні, соткі новых працесаў і даразьных судоў — ўсё гэта зьяўляецца аздобаю польскае рэакцыі сягодняшняга дня.

У будучыне мы павінны чакаць новых рэпрэсыяў, новых ахвяраў, новых дзён гвалтаў і барбарынскае расправы ашалелае шляхты.

Рэакцыя зьбіраецца не на жарт панаваць. Рэакцыя покуль што пануе.

І пад ўплывамі гэтае рэакцыі у слабых апускаюцца рукі, падае вера...

Масы, якія ўчора гатовы былі ісьці ў бой, ісьці на барыкады,—заўтра могуць заснуць і лёгка заснуць у мешчанскім, абывацельскім сьне.

Націск рэакцыі павінен вучыць нас усіх, у каго не пагас яшчэ агонь у сэрцы. Ня трэба сябе ашукваць, а на рэальнасьць трэба глядзець трэзва. **У гэтыя цяжкія, чорныя часы трэба згуртаваць у адзін кулак ўсё што ёсьць моцнага, вернага рэвалюцыі і партыі і нясьці ліхтар камунізму праз цьму рэакцыі ізноў да масаў.**

Рэакцыя ідзе, наступае, але яна ня вечна. Шалёны націск яе—прызнак яе слабасьці, хваблівасьці.

Як доўга яна працягне, трудна гадаць. Усё магчыма. Магчыма, што яна хутка пераступіць тую грань, якая ёй паложана гісторыяй. Магчыма, што як мыльны пузыр яна лопне і зноў шырока адчыніць дзьверы пабеданоснай камуністычнай рэвалюцыі. Але на гэты час, час пераходны, трэба трымацца цьвёрда, моцна. Партыя у гэты час павінна пазбавіцца і бюракратызму, і тупога фармалізму, і слабых людзей. Усё што мешаець партыі, ўсё трусьлівае, мешчанскае павінна быць выкінута з партыйнага карабля. Лепш менш да лепшых, верных, цьвёрдых, якія вытрымаюць націск ворага, вагартуюцца у барацьбе, каб з новымі сіламі, дачакаўшыся рэвалюцыі, кінуцца на ворага і дабіць яго.

Дык прэч з самахвальствам, комчванствам, кар'ерызмам, казённым „благополучием“ і інтрыгамі.

Хто хварэў і хварэе на гэта, павінен прызнаць, што ня час для гэтага.

Дарма буржуазея радуецца і трубіць аб развале, расколах партыі і г.д., трымаючы хатнія непаразуменьні і спрэчкі за слабасьць камуністычнага руху.

Заўтра, пабачыўшы сілу камунізму, буржуазея не заплача, а завые са злосьці

ПРЭЧ КАТАЎ-АКУПАНТАЎ!
НЯХАЙ ЖЫВЕ ЎЛАДА РАБОЧЫХ І СЯЛЯНАЎ!
НЯХАЙ ЖЫВЕ БРАТЭРСТВО ЎСІХ НАРОДАЎ!
НЯХАЙ ЖЫВЕ САЮЗ САЦЫЯЛІСТЫЧНЫХ САВЕЦКІХ РЭСПУБЛІК — ПРАДВЕСЬНІК КАМУНІЗМУ!

СУЧАСНЫЯ ПРЫПЕЎКІ

Вые бура, лес шуміць,
Уцекаюць зьверы.
Мы ня сьцерпім больш прыблуд
І хто панскай веры.
Як ты сьцюжа не ваюй,
А крынічка буркаціць.
Як ты Польшча не пануй,
Трэба будзе уступіць.
Эй, Варшава, нас ня руш
Ды на лбе сабе адзнач,
Што ўсім крыкнуў беларус:
— Я вам больш не папіхач!
У бары камары
Пялі пяюшкі.
Польшча прэч, ня дуры —
Мы табе ня служкі.
Пан да пана шыта-крыта,
Іх Антанта круць і верць.
Трах разьбілася карыта —
Цап за панскі карак сьмерць.
Бот варшаўскі, бот фарсісты
Топча Беларусь.
Што варшаўскага фасону
То ярмо, прымус.

Польшча, сьметніку куток,
Слывець век ланамі;
Польшча, трасца ёй у бок,
Пануе над намі.
Эмісар ты ганарысты,
На паперы камуністы,
Пець прыпевак не жадаеш,
З вёскі ракам выпаўзаеш.
Вывеў польскі пан пузаты
Волю-долю з нашайхаты;
Охі-ўздохі кіну-рыну,
Торгну пана за чупрыну.
Ой, грызець нутро нядоля,
Ў хаце нэндза як ніколі.
Шумна вуліца вячуе,
Польшча на ражон гарцуе.
Кінь нудой нудзіць людзей,
Годзі службаю служыць,
Глянь, варшаўскі ліхадзей
Скукярэчыўся, дрыжыць.
Дома, ў полі, між людзей
Аб Саветах ду-ду-ду.
Сьцерпіць трудна чым далей
Нам паўстанчую зуду.

ХРОНІКА.

Нягодныя акупанты „працуюць“.

— АРЫШТЫ ПЕРАД ПЕРШЫМ МАЯ У ЗАХ. БЕЛАРУСІ. Каб пазбавіцца першамайскіх выступленьняў у Заходней Беларусі, акупанты загадзя ўзяліся за арышты.

Пад відам „дывэрсыйных бандаў“ забіраюць ўсіх, хто хоць трохі вызначаецца сьвядомасьцю. Арыштоўваюць нават настаўнікаў польскіх школ, вышаўшых з беларусаў.

Так у Наваградскім ваяводстве у пачатку гэтага месяца на прыказу ваяводы адразу ў два дні было зроблена больш 2000 вобыскаў. Забралі ўсіх падпішчыкаў легальных беларускіх газэт, ўсіх карэспандэнтаў, ўсіх сялянаў, якія стараліся падаць дэкларацыі аб адчыненьні беларускіх школ. Лік арыштаваных у Наваградскім ваяводстве больш тысячы.

Турмы у Наваградку, Валожыне, Дзісьне, Стаўпцах, Баранавічах перапоўнены да адказу. Арыштаваным не даюць есьці і зьдзекуюцца. Тых, якія не зьмясьціліся у турмы, трымаюць у брудных мешканьнях.

12 і 13 красавіка былі зроблены масавыя вобыскі у Сьвенцянскім павеце. Шукалі так сама „дывэрсыйнае банды“ і нашае літэратуры. Усяго арыштавана больш 20. Трэба спадзевацца, што да першага мая нягоднікі пастараюцца яшчэ арыштаваць тысячы сялянаў на Віленшчыне і Гарадзеншчыне.

Але дарма. Тэррорам акупанты толькі даказваюць нашу справядлівасьць і расчыняюць вочы нават самым пасыўным сялянам, куды іх вядзе акупацыя.

— ПРАЦЭС БЕЛАРУСКІХ І ЛІТОЎСКІХ ПАЎСТАНЦАЎ. 21-ага красавіка у Горадні пачаўся працэс 75 беларусаў і літоўцаў, абвінавачаных у арганізацыі паўстанчаскіх атрадаў. Абвінавачаных бароніць шмат адвакатаў, сярод якіх з Варшавы Смяроўскі, Бабянскі, Дурач, а з Вільня Врублеўскі і Міцкевіч.

Гэты палітычны працэс зьяўляецца адгалоскам вядомага ўжо Беластоцкага працэсу, які адбыўся у 1923 годзе і па якому былі асуджаны Баран, Маслоўская і іншыя.

— ВІЛЕНСКІ ПРАЦЭС 120-ці. У хуткім часе у Вільні распачнецца вялікі палітычны працэс 120 віленскіх работнікаў і работніц, якіх абвінавачваюць у належнасьці да Камуністычнай Партыі Заходней Беларусі.

Увесь працэс пабудованы на правакацыі Гэрцыка.

З прычыны вялікага ліку абвінавачаных і сьведак працэс, як кажуць, мае быць не ў будынку акружнага суда, а ў Гарадзькой салі.

Ад Віленск. Акружн. Камітэту Кам. Партыі Зах. Беларусі.

Віленскія чарнасоценныя і спэкулянтскія газэты трубілі у сакавіку, што нібыто паліцыі удалося арыштаваць прэзыдыум віленскага акружнага камітэту КПЗБ, што нібыто гэты прэзыдыум выносіў нейкія сьмертныя прыгаворы нейкім правакатарам і г. д.

Заяўляемо, што ніякага арэшту віленскага акружнага камітэту ня было і ніякіх сьмертных прыгавораў ён ня выносіў. Калі ж у газэтных плётках дэфэнзывы і ёсьць хоць троха праўды, дык відаць тут маемо справу з якімісь шарлёк-хольмствуючымі падросткамі, якія гуляюць ў камунізм, суды, сьмертныя прыгаворы і другія заўлекацельныя сучасныя модныя гульні.

КАРЭСПАНДЭНЦЫІ.

Катуюць і грабяць сялян.

Праз вёску **Бакшты**, Гарадзецкае гм., Вялейск. павету праведзены тэлефон. У студні месяцы трэба было на бяду тэлефоннаму дроту абарвацца. Паліцыя, даведаўшыся аб гэтым, напала ноччу на варту в Бакшты і пачала яе катаваць тут жа на вуліцы, дапытываючыся, хто абарваў дрот. Адзін з вартаўнікоў, малады хлапец, на могучы трываць больш пабоеў, бадай бяз памяці ўжо, паказаў на двух гаспадароў. Як груганы накінуліся паліцыянты на гэтых гаспадароў, перавярнулі ўсё ў хаце шукаючы нібы дроту. Нічога не нашоўшы, забралі варту на пастарунак коннай паліцыі ў в. Караблі і там зноў пачалі катаваць у нічым непавінных людзей. І зволыйлі іх толькі тады, калі пачалі пацягіваць абарваны дрот і самі дазналіся, што ніхто гэтага дроту не абрываў, а ён разьвязаўся сам.

Вёска Вялікае Сяло, Маладэчанскае гм. Ў часе вайны некулькі разоў да пічэнту згарэла. Гаспадары ніяк ня могуць стаць на ногі, жывуць галадаючы і па зямлянках. Дык дзе-ж тут казаць аб выплаце падаткаў, аднак панскі ўрад апошняе выціскае, каб на гэтыя грошы утрымліваць розных наездных прыблуд і паліцыянтаў-жывадзёраў. Наляцеўшы раз ноччу на в. Вялікае Сяло, паліцыя пачала апісываць і адбіраць за падаткі гаспадарскія прыпасы, хатнія рэчы ды жывеліну. Бралі падушкі, апошнія вопраткі, а ў каго і гэтага не нашлося, дык бралі сталы і ўслоны. У аднэй ўдавы тэй жа вёскі, у якой муж памёр ад ран недаўняй вайны, забралі панскія паслугачы адну адзіную яе кароўку, аставіўшы ўдаву і дзяцей ў зямлянцы бяз сродкаў да жыцьця, бо і хлеба яна ня мела. Вывеўшы ў кірмашны дзень прадаваць карову, паліцыянты прастаялі да вечара, але каровы ніхто не хацеў купляць, нават і гандляры не захацелі чужой ўдовінай бяды. І такім чынам карову прышлося назад адвясьці.

Калі прыяжджае які чынадрал пісаць пратакол за неаплату, дык прыпісывае і выдаткі на сваю паездку і яшчэ розную трасцу, і так выходзяць гэтыя падаткі ў двоя-троя больш, а калі наш брат запрацуе нічога ня варты польскі грош ды ў польскага падрадчыка Бернацкага (будова вайсковых казармаў у Галянове), дык месяцамі нельга спагнаць. А калі хто дапытываецца свайго ў гэтага ягомасьця Бернацкага, дык ён паліцыю прызывае.

У тую-ж вёску прыехаў раз таксама ноччу памошнік каманданта паліцыі м. Маладэчна са сваімі ваўкадавамі. Як зьвяры наскачылі на жыхара Бондара Яна—ператорманшылі ўсе рэчы, узрывалі падлогу, загадывалі гаспадару пад печ лазіць. Так назьдекаваўшыся і нічога не нашоўшы, зрабавалі лепшую бялізну і вопратку і хоць бы што.

— **Камандант Палачанскага пастарунку (Валожыншчына)** прызваў на пастарунак 13-ці годняга хлапца Кісьліцкага з вёскі Чарапы тэй-жа гміны. Калі гэты малалетак прышоў, дык камандант загадаў разпрануцца і легчы на лаву і пачаў сам катаваць на сьмерць перапужанага хлапца, які стаў прасіцца і і крычаць гвалту. Тады паліцыянт заткнуў яму рот, усьсеў на галаву, а камандант далей біў. Зьбіўшы да безчуцьця, пратрымалі дзяцё колькі дзён.

І ўсё гэта за тое, што жонка каманданта ішла праз вёску ў той час, калі дзеці гулялі, і быццам гэты хлапец незнарок ударыў яе сьнежкай.

Хай жа восіць воўк—панясуць і воўка.

Атрымана на Фонд Друку.

„Варшавяк“ за літ. 2 зл., А. 25 зл., Тад 10 зл., Я — 25 зл., янв. 12 зл., ап. 9 зл., март 15 зл., фв. 6 зл. Лісты №№: 41—85 зл., 43—39 зл., 44—34 зл. 50 гр., 45—51 зл 50 гр., 47—38 зл. 50 гр., 48—25 зл., 49—70 зл., 51—62 зл. 50 гр., 52—27 зл., 53—16 зл., 55—48 зл., 58—89 зл., разам **690 зл.**

З прычыны таго, што дуракаватыя эмісары пашыраюць аб нас розныя плёткі, між іншым і тое, што нібыто наша партыя дастае грошы на сваю работу ад буржуазеі, літоўскага ўраду, нават ад польскае дэфэнзывы (?!!), заяўляем ўсім таварышом, што **грашовы адчот, як прыход, так і расход, у любы час можа праз нас быць прадстаулены для кантрольнае і рэвізыйнае камісіі Камінтэрну.**

Спадзяваемся, што пасьля гэтае заявы у партыі ня знойдзецца ваіўных таварышоў, каторыя паверац бруднай брахне варшаускіх халуёў.

(Мы стараліся у майскі нумар не зьмешчаць нічога палемічнага супроць казенных эмісараў, але у апошні момант, перад самым выпускам газэты нам зноў данясьлі аб злачыннай брахне, якую яны не пакінулі яб нас пашыраць. Дзеля гэтага мы прымушаны былі зьмясьціць вышэй пададзеную заявку).

ВІЛЬНЯ, ДРУКАРНЯ КАМУНІСТЫЧНАЕ ПАРТЫІ ЗАХОДНЕЙ БЕЛАРУСІ